Кошт паштовай перасылкі аплачаны агулам.

Цана асобнага нумару 250.000 м.

Голас Беларуса

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12, п. 6. (Wileńska 12 m. 6).
Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 г. штодня апрача сьвяточных дзён. Адміністрацыя ад 9 да 3 г.

Выходзіць тры разы у тыдзень.
Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 3.000000 м.
Для заграніцы удвая даражэй.

Няпрынятыя у друк рукапісы назад не вяртаюцца.
Аплата надрукованага залежыць ад Рэдакцыі.
Цана абвестак: перад тэкстам 400.000 мк., сярод тэксту 300.000 м. і на 4 стр. 250.000 м., за радок пэтыту у 1 шп.

№ 15. Вільня, Серада, 2-га красавіка 1924 г. Год I.

На заходні фронт!

Абраз шырокае і вольнае беларускае творчае працы на грунце тварэньня нацыянальнае культуры і сваей дзяржаўнасьці ў Радавай Беларусі, усё паўней раскрываючыся перад вачыма беларускага насяленьня Заходняе Беларусі, будзіць сярод тутэйшых беларусаў гарачы энтузіязм і глыбокую веру, што раней ці пазьней настане часіна поўнае перамогі беларускае ідэі *наабапал гранічнае лініі*, якая разрэзала нашу Бацькаўшчыну на дзьве паловы. Людзі, якія тут, на дэмакратычным" Захадзе, прывыклі бачыць адно толькі бязглузды ўціск і зьдзекі над сабою, углядаюцца на Усход, як-быццам заварожаныя. I зусім зразумелым зьяўляецца ў іх мімавольны парыў: кінуць гэты край няволі і суму і йсьці туды, дзе так вабяць шырокія магчымасьці нацыянальнае працы, — ісьці на Усход....

Але далёка ня ўсё натуральнае і зразумелае зьяўляецца правільным і добрым, гледзючы з боку беларускіх нацыянальных інтарэсаў. I хаця мы дужа добра разумеем гэны парыў, аднак лічым сваім грамадзкім абавязкам перасьцерагчы, каго сьлед, перад крокам, які для беларускае справы быў-бы нязвычайна *шкодным*.

Проці Заходняе Беларусі вядзецца кампанія дзеля дэнацыяналізацыі не палякамі, якія маюць у сваіх руках такі магутны апарат дзеля барацьбы з беларускім насяленьнем, як дзяржаўная ўлада, адміністрацыя, усе дзяржаўныя установы, школа, войска,—урэшце царква. Пазбаўляючы нас нацыянальные школы, забіраючы нашу зямлю, не даючы „абыватальства", заліваючы Заходнюю Беларусь польскімі асаднікамі, урадоўцамі, паліцэйскімі, жандарамі, вучыцялямі і прафэсарамі, Польшча маніцца — як прызнаўся некалі п. Скульскі — дабіцца таго, каб за 50 гадоў пад уладай Польскае Рэспублікі і з агнём нельга было знайсьці беларуса. I людзям малое веры і слабога сэрца можа здацца, што, маючы ў сваіх руках такое магутнае аружжа, Польшча запраўды лёгка здолее дапяць сваей мэты.

Але гэта—мана! Ня здолела-ж царская Расея за сто з лішкам гадоу панаваньня абмасковіць беларускія масы, нацыянальна йшчэ зусім несьвядомыя і пазбаўленыя сваей інтэлігенцыі, хаця расейская ўлада была ў тысячу разоў дужэйшая за польскую! Ня здолела абнямечыць сваіх палякоў і кайзэраўская Нямеччына, хаця здавалася, што яе высокая культура бяз ніякага высілку сама сабой запануе над польскімі масамі. I ня здолее дапяць свае жываедзкае мэты Польшча, ня гледзячы на самае цеснае аб'яднаньне дзеля барацьбы з беларусамі польскага грамадзянства і польскае ўлады, польскага прафэсара і польскага жандара.

Беларусаў не зьядуць, бо, як удачна выразіўся пасол Тарашкевіч, „хіена жывіцца трупамі, а народ беларускі — жывы!" — Не зьядуць, але *многа шкоды могуць нам зрабіць*, асабліве, калі мы ня здолеем, як сьлед, наладзіць *самаабарону*. Заходняя Беларусь знаходзіцца ў самым нявыгадным палажэньні ў гэнай барацьбе за свой быт, — і іменна з гэтае прычыны мы павінны напружыць і згуртаваць усе найлепшыя свае сілы дзеля самаабароны. Кожын сьвядомы беларус павінен гэта добра зразумець, павінен усей душой праняцца выпаўшай на нашу долю задачай абароны найбольш загрожанага форту нашае нацыянальнае крэпасьці.

Мы павінны ўсьцяж памятаць яшчэ і аб тым, *якое значэньне для агульна-беларускае справы мае Заходняя Беларусь*. Ня кажучы ўжо аб такіх важных культурных цэнтрах яе, як Вільня, ці прамысловых, як Беласток, ня кажучы аб яе лясных багацьцях і сплаўных рэках (Нёман), мы хочам адзначыць *палітычную роль* Заходняе Беларусі ў *расейска-польскай канкурэнцыі*: сьмела можам сказаць, што ў справе пашырэньня Усходняй Беларусі, паміма агульнае перамены фронту ў нацыянальным пытаньні, вялізарны ўплыў мела також і жаданьне прыцягнуць сымпатыі Заходняе Беларусі да Усходу. Калі-б жа беларусы самахоць пакінулі свой заходні бастіон, калі-б нашы найбольш актыўныя сілы пайшлі па лініі найменшага праціўленьня і перакачавалі ў Усходнюю Беларусь, дзе *цяпер—лепей*, калі-б гэткім парадкам як быццам *падаравалі* Польшчы ў поўнае ўладаньне сваю зямлю і яе народ,—дык ад гэткае здрады і адступніцтва пацярпела-бы ня толькі беларуская справа наагул, але і Беларусь Усходняя. Што перажыткі старога маскоўскага імпэрыялізму яшчэ ня зусім зломлены, што нават камунізм не здолеў выкараніць іх да канца, аб гэтым сьведчыць факт, што ня ўся Усходняя Беларусь аб'яднана з менскім цэнтрам, што Масква задзержывае яшчэ ў сваіх руках цэлы рад усходніх беларускіх паветаў, хаця аб іншых з іх, як да прыкладу аб Гомельскі і некаторыя паветы Чарнігаўшчыны, магла-бы з беларусамі паспрачацца хіба толькі Украіна, але ніколі не Маскоўшчына....

Вывад з усяго гэтага—адзін: *усе жывыя сілы Заходняе Беларусі—на заходні фронт*! Хоць і заманчывыя пэрспэктывы працы ў *сваей* Рэспубліцы на Усходзе, хоць і цяжкі абавязак барацьбы за свой народ у *найгоршых абставінах*, у якіх знаходзіцца Заходняя Беларусь, але той, хто хоча ня толькі *звацца* беларусам, але і *быць* ім, не павінен выбіраць, што *для яго* лепей, а выключна стаяць на тым, што лепей *для Бацькаўшчыны*.

Што дадуць новыя выбары у Эурапэйскія Парлямэнты?

V. Важнасьць нямецкіх выбараў.

Важнасьць будучых выбараў у Нямеччыне, якія маюць адбыцца 4 траўня, зразумела кожнаму.—Цэлы шэраг найбольш палючых справаў ня толькі ўнутрана-нямецкіх, але перадусім агульна-эўрапэйскіх сьцісла зьвязаны з пытаньнем, хто будзе правіць у Нямеччыне, а гэта ў значнай меры залежыць ад таго, які будзе склад Рэйхстагу Нямецкай Рэспублікі.

Коратка кажучы, ад вынікаў нямецкіх выбараў будзе таксама, як і ад французскіх, значна залежаць, ці Эўропа здалее *абмінуць пагражаючую ёй вайну*, ці не... — ці атручываючы ўсю Эўропу тлеючы агонь ненавісьці паміж абодвума сьмяротнымі ворагамі пачне тухнуць, ці наадварот—разгарыцца ў вялікі пажар...

Якраз дзеля таго можна сказаць, што вынікі нямецкіх выбараў у значнай меры залежаць ад тэй *сілы французскай рэакцыі*, якая будзе душыць Нямеччыну ў працягу выбарнай кампаніі. I—наадварот—вынікі французскіх выбараў, (якія адбудуцца праз тыдзень пасьля нямецкіх), у значнай меры будуць акрэсьлены вынікамі нямецкіх...

Вельмі цікава дзеля таго пагляд́зець на той унутраны стан, на тую групіроўку партый, з якімі Нямеччына ўступае ў пачаўшуюся ўжо выбарную кампанію.

VI. Чаму распушчаны нямецкі Парлямэнт.

Перадусім цікава, што Рэйхстаг быў распушчаны прэзыдэнтам Эбэртам па прапазыцыі ўраду Маркса,— як быццам з прычыны опозыцыі *роўна* з абодвух бакоў—зьлева і справа; але гэты роспуск ідзе не на карысьць сацыялістычнай лявіцы, а наадварот — вельмі *на руку правіцы*. Можна сказаць нават, што, ня гледзечы на опозыцыі правіцы ўраду, роспуск Рэйхстагу зроблены *па яе падшэптам*.

Урад распусьціў Рэйхстаг дзеля таго, што сацыялісты і правіца адмовіліся прадоўжаць ураду безварунковыя яго вынятковыя паўнамоцтвы, паставіўшы новыя варункі, якіх *ня прыняў урад*.

I вось, вельмі важна для зразуменьня сітуацыі,— якія-ж гэта няпрыемныя для ўраду варункі пастаўлены яму зьлева і справа.

Лявіца (сацыялісты) патрэбавала перадусім прынцыповых гарантыяў рэспубліканскага ладу і пільнаваньня сацыяльнай справядлівасьці пры правядзеньні аздараўленьня гаспадаркі і фінансаў краю. Патрэбавала яна перадусім захаваньня 8-гадзіннага дня працы, скасаваньня крыўдных для бедных клясаў падаткаў, панавеньня абароны лёкатораў, апекі над безработнымі і пэнсіянерамі, якіх не шкадуе цяперашняя ўрадовая „санацыя скарбу" і т. п. У галіне заграмічных адносінаў лявіца трэбавала палітыкі паразуменьня і міру...

I вось усё гэта адкінуў урад Маркса... Але-ж амаль ня ўсё гэта таксама адкінулі самі сацыял-дэмакраты, галасуючы першы раз за паўнамоцтвы...

Правіца з свайго боку, па змове з урацам, ставіла тактычна свае, наўмысна крайнія варункі, каб даць ураду пазоры безстароннасьці...

I ўрад, заявіўшы, што не дапусьціць нават дыскусіі на тэму паўнамоцтваў, бо гэта адно ўжо можа пашкодзіць справе санацыі скарбу, распусьціў Сойм...

VII. Хто будзе канкураваць на выбарах?

Як ведама, у выніку палітыкі Пуанкарэ, за апошні год у Нямеччыне з каркаломнай хуткасьцю даканалася *абядненьне шырокіх народных*, а перадусім *працоўных* масаў побач з узбагачэньнем невялікай группы капіталістаў, якая цяпер усё мацней захоплівае ўладу... Уся гэтая магутная да вайны „Нямеччына сярэдніх клясаў" (Tüchtige Mittelstand") зусім згалела. Сацыял-дэмакраты маюць вельмі даўгі сьпісак грахоў (апошні грэх—галасаваньне за вынятковыя паўнамоцтвы буржуазна-рэакцыйнаму ўраду...) і страцілі ў значнай меры ўплывы на насяленьне...

Вось, як характарызуе сітуацыю ў краі с.-д. пасол Брэтшэйд у камунікаце Міжнароднага Агенства Сацыялістычнай Прэсы.

Ён кажа, што правіца не магла дачакацца павольнага паправеньня парлямэнту, прыдраўшыся да прыпадку, абвініла с.-д. у сабатажу санацыі скарбу і дабілася распушчэньня Рэхстагу. Ён сьцьвярджае, што мамэнт для гэтага выбраны вельмі спрытна. — Шырокія масы, зруйнаваныя інфлянцыяй (паводкай абязцэненых папяровых грошаў), з бяды і голаду ў найвышэйшай ступені здэмаралізаваны сацыяльна-палітычна. У якой меры ўрад, які падтрымлівалі сацыял-дэмакраты, руйнаваў работніцкія масы, відаць хаця-б з таго, што за 1923 г. ад падаходнага падатку з галодных працаўнікоў скарб узяў 181 мільёнаў зал. мар., а з абшарнікаў, прамыслоўцаў і іншых капіталістаў— толькі 30 мільёнаў зал. мар.!!

У дадатку — санацыя пачалася „стабілізацыяй маркі", якая на даўжэйшы час 22 мільёны насяленьня Нямеччыны зрабіла амаль што жабракамі...

Усё гэта, зразумела, давяло бадай да поўнага развалу тых палітычных, эканамічных і прасьветных арганізацыяў нямецкіх работнікаў, якімі гэтак славіўся да вайны нямецкі пралетарыят... I вось, на гэтым *мафальна эканамічным разгроме арганізацыяў работнікаў*, якія ў значным ліку *вінавацяць у гэтым сваім паражэньні сваіх ствapыўшых супольны фронт з буржуазіяй правадыроў, нямецкая рэакцыя і пачынае будаваць быццам надоўга больш глыбокія і трывалыя ўкра леньні...*

Падтрымліваныя яшчэ нядаўна праз с.-д. у Рэйхстагу, капіталісты цяпер ужо зусім адкрыта аб'явілі вайну ўсім сацыяльным заваяваньням працоўных масаў, а нават ня толькі тым, што здабыты былі сілай рэвалюцыі, але і тым, што істнавалі да вайны!..

З другога боку мільёны зпаўпэрызаваных (згалеўшых) прадстаўнікоў сярэдніх клясаў, ня кажучы ўжо аб страціўшых веру і даверые да сваіх правадыроў работнікаў, *бачаць выхад з ствapыўшагася па-*

лажэньня ў сацыяльнай рэвалюцыі, і ідуць за нямецкай камуністычнай партыяй.

І вось, з аднаго боку ўсе правіцовыя ўгрупаваньні, як мы падавалі, злучаюцца ў *адзіны магутны блёк*, прыбіраючы новыя, больш трафляючыя да вуха і смаку ня вельмі палітычна выробленага сярэдняга нямецкага выбаршчыка партыйныя назовы. Маючы каласальныя грашовыя сумы, гэтак патрэбныя ў часе выбараў, яны зьяўяцца ў значнай меры гаспадарамі палажэньня...

З другога боку—магутны сваей крытыкай, сваім паступовым пралетарскім радыкалізмам, і магутным надтрыманьнем міжнароднай арганізацыі камуністычны лягер...

Вось паміж гэтымі крайнімі ворагамі будзе йсьці барацьба, вынікі якой, як згаджаюцца ўсе, будуць мець каласальнае агульна-эўрапэйскае значэньне...

VIII. Хто пераможа?

Хто-ж з іх пераможа, і што будзе азначаць перамога кожнага?

Калі пераможа правіца, кіраваная праз манархістаў, дык уся нямецкая палітыка прыме адразу востра-баявы тон... І, зразумела, гэтая „нямецкая небясьпека“ вельмі хутка ізноў *пагодзіць Англію з Францыяй на францускай палітычнай лініі...* А гэта ізноў падалье масла ў агонь тлеючага эўрапэйскага пажару...

Спадзявацца рашучай перамогі камуністаў пры сучасных варунках тэрору і рэпрэсіяў няма падставаў...

І вось, як можна ўжо судзіць з вынікаў выбараў да Ляндтагаў (соймы асобных дзяржаваў Нямецкага Саюзу) і да самаўрадаў, як напр., у Саксоніі, Тюрынгіі, Мэкленбургу, дзе насяленьне *аддавала свае галасы толькі гэтым абодвум крайнім кірункам*, нашыя папярэднія прыпушчэньні зусім падцьвярджаюцца: прышлы Рэйхстаг *разаб'ецца на дзьве крайня-варожыя паловы...* Чым такі Парлямант можа стаць для Нямеччыны, трудна прадугледзець. Але — што ён ня будзе такім *пасыўным*, як той, што толькі што стаў нябошчыкам,—якім кіравалі ў значнай меры *сярэднія* цячэньні, які гэтак „лагодзіла“ адносна да самых важных справаў жыцьця нямецкага народу нямецкая сацыял-дэмакратыя, гэта—пэўна...

У кожным разе ад будучых нямецкіх выбараў трэба чакаць *рашучага зрушэньня* Эўропы з *вэрсальскага мёртвага пункту...* Ня трэба забываць, што толькі што скончылі сваю працу абодвы камітэты рэчазнаўцаў—і хутка стане ўва ўвесь рост справа адшкадаваньняў...

Ці здалее што зрабіць для мірнага вырашэньня міжнароднага напружаньня ў гэткіх зложаных абставінах ці то Ліга Народаў ці такі ветлівы „джэнтльмэн“, як п. Мак-Дональд, з усімі тымі „пігулкамі ад землятрасеньня“, якія маюцца ў іх парлямэнцкіх, ці міжнародных аптэчках, у гэта палітычны оптымізм можа, як сказана, толькі верыць...

Цьвяроза гледзячы, трэба сьцьвердзіць, што новыя выбары *не дадуць адразу* Эўропе ані патрэбных розуму і добрай волі яе кіруючых вярхоў, ані рашучага ўплыву на справы працоўных народных масаў...

А гэта значыць, што мірнага выхаду Эўропы з сучаснага тупіку спадзявацца трудна...

І недарма гэтак кампрамітуецца паўсюль у Эўропе цяпер і самая ідэя парлямэнтаў... **М.**

Грамадзян падпішчыкау газэты „Голас Беларуса“, якія яшчэ не надаслалі падпіскі на красавік месяц, просімо пасьпяшыцца, каб ня было перарыву у атрымліваньні газэты.

Адміністрацыя.

Палітычныя падзеі.

Цыркуляр Солтана.

Перад выхадам у адстаўку б. мін. унутран. спраў, п. Солтан выдаў цыркуляр да ўсіх ваяводаў, каб моцна забаранялі сваей паліцыі і вастрожнай адміністрацыі біць і катаваць арыштаваных пры „dochodzeniach“ і адбываньні кары.

Добра, што хаця прызналіся нарэшце!. — Бо чакаць напраўду паправы, калі, як сьцьвярджае „Kur. Polski“, нават вышэйшыя прадстаўнікі паліцыі даводзяць, што „бяз пытак ня можна карысна для справы правясьці ніводнага папярэдняга сьледзтва“—спадзявацца вынікаў гэтага „шляхотнага“ цыркуляру адстаўнога ўжо міністра няма чаго... у кожным разе на Крэсах усё застанецца па старому... Бо сам жа п. Солтан піша ў цыркуляры, што паліцыя прадаўжае біць, „ня гледзячы на неаднаразовыя станоўчыя забароны“...

Працэс камуністаў.

У варшаўскім судзе распачаўся вялікі працэс 31 „камуністаў“. Пасярод абвінавачаных пераважна моладзь ад 18—28 гадоў, адзін вучыцель гімназіі і 2 жаўнера. Акт абвінавачаньня закідае падсудным належаньне да камуністычнай партыі, ладжаньне мітынгаў і паходаў на чэсьць расейскай рэвалюцыі, Леніна і Троцкага, і распаўсюджываньне камуністычнай літэратуры. Бароняць лепшыя варшаўскія адвакаты.

Абшарнікі дамагаюцца павялічэньня дня працы.

У Пазнані толькі што адбыўся зьезд абшарнікаў, якія прынялі рэзалюцыю аб тым, каб у законадаўчым парадку быў павялічаны дзень працы сельскіх работнікаў — батракоў. Пасьля прамыслоўцаў, трэбуючых павялічэньня дня працы на фабрыках, цяпер выступаюць і абшарнікі. Як ведама, цяперашнія „кантракты“ абавязываюць батракоў у часе 4-х летніх месяцаў працаваць аж 11 гадзін у суткі, ня лічачы таго, што гаспадар мае права змусіць работніка працаваць яшчэ, сколькі патрэба, за асобную даплату. Але абшарнікам гэтага ўсяго мала.—Бо пачулі сілу...

Лёкауты.

Урад гуты Шчакава ў Галічыне раптам зачыніў фабрыку і выкінуў больш як 400 работнікаў на вуліцу.—Ведама, каб пасьля вярнуць усіх назад, але за меншую плату...

Найвялікшая ў Польшчы фабрыка цэлюлезы пастанавіла на 2 тыдні спыніць працу. Гэтым выкідаецца на вуліцу 1.000 работнікаў. Мэта гэтага манэвра— націснуць на ўрад, каб ён забясьпечыў фабрыку ад канкурэнцыі заграніцы, ці папросту дазволіў яе ўласьнікам спэкуляваць, паднімаючы цэны...

Правы ваяводаў.

Рада міністраў, паміма Сойму, выдала вельмі важны, прынцыпова зьмяняючы ўсю „канстытуцыю“ правінцыяльных уладаў, загад які надае ваяводзе запраўды сатрапскую ўладу ў ваяводзтве.—Бо бяз ведама і згоды пана ваяводы ня можа быць ані назначаны ані пераведзены ніводны ўрадовец усіх міністэрстваў, апроч ваеннага. Польскія ваяводы маюць стаць тым, чым былі расейскія губэрнатары царскіх часоў...

Яшчэ адзін крок на шляху пэратварэньня Польшчы ў клясычнае „паліцэйскае гаспадарства“...

Выхадкі эндэцкіх студэнтаў.

На публічнай лекцыі ў Кракаве вядомага петраградзкага, цяпер варшаўскага, прафэсара Бодуэна-дэ Куртэнэ, (аднэй з найсьвятлейшых асабістасьцяў у Польшчы, даўняга прыяцеля беларусаў), які чытаў аб справе нацыянальных меншасьцяў у Польшчы, група студэнтаў-эндэкаў закідала 80 гадовага лектара гнілымі яйцамі...

Паліцыя б'е работнікаў.

У м. Пабіяніцах на сабраўшыхся перад гмакам завода Кіндлера бастуючых работнікаў раптам наляцела конная паліцыя і шаблямі і прыкладамі пачала біць работнікаў, і таптаць іх коньмі... Паліцыя вінавацiла работнікаў, але цяпер гарадзкая Рада сьцьвердзіла публічна „правакацыйнае павядзеньне“ і ня выкліканы патрэбай гвалт паліцыі...

Прыезд дэлегацыі С.С.С.Р. у Варшаву.

На днях прыбывае ў Варшаву дэлегацыя ССРР. для заключэньня з Польшчай камунікацыйнай умовы.

Прызнаньне ССРР праз Вэнгрыю.

Вэнгерскі ўрад мае дэлегаваць у Маскву б. мін. загран. спраў п. Гратца, каб падгатаваць грунт да ўзнаўленьня нармальных адносінаў паміж абодвума краямі.

Прызнаньне ССРР праз Канаду.

Канадзкі прэм'ер Кінг выслаў да радавага прадстаўніка ў Бэрліне тэлеграму аб тым, што ўрад Канады пастанавіў прызнаць праўна ССРР.

Сэнс і значэньне перамены ураду ува Францыі.

Пуанкарэ сфармаваў новы габінэт. Трэба падкрэсьліць—для зразуменьня перамены,—што толькі сам Пуанкарэ—прэм'ер, ён-жа мін. заграчічных спраў, і міністры ваенны і публічных работаў у новым урадзе асталіся ад старога.

Абодвы гэтыя міністры сьцісла зьвязаны са справай акупацыі Руры. — Дык ясна перадусім, што ў справе Руры пакуль што п. Пуанкарэ зьмяніць нічога намеру ня мае... У габінэт увайшлі наагул больш аўтарытэтныя дзеячы, і дзеля таго можна лічыць, што п. Пуанкарэ ўдалося ўмацаваць у сучасным парлямэнце сваё становішча. П. Пуанкарэ, відаць, і правядзе новыя выбары... Вельмі цікава для нас і тое, што наагул новыя міністры значна менш палянафільскія (менш прыхільныя да Польшчы), як іх папярэднікі... Найбольш яскрава гэта відаць на 2 міністрах.—Мін. прасьветы п. Жювэнэль, зьяўляецца галоўным рэдактарам вельмі „халоднай“, каб не сказаць мацней, да Польшчы уплывовай газэты „Матэн“ („Раніца“), і да таго—гарачым прыхільнікам рашучай акцыі Лігі Народаў; новы мін. фінансаў, п. Марсаль, напрыклад, вельмі востра выступаў проці вядомай пазыкі Польшчы 400 міл. франкаў і лічыць гэтую наагул пазыкавую палітыку францускага ўраду аднэй з галоўных прычынаў зруйнаваньня яе валюты...

Ужо колькі месяцаў таму мы казалі, што гэтая пазыка будзе апошняй... Вельмі важна наагул падкрэсьліць, што на шляху ўжо афіцыяльнага ахаладжаньня Францыі да Польшчы, якое даўно ўжо адбываецца ў парыжскай прэсе паволі, але рашуча, зроблены яшчэ адзін вельмі выразны крок... Ці хоча ці ня хоча Пуанкарэ, але варочаючыся да ўлады, каб весьці гутарку з Мак-Дональдам аб справах нямецка-францускіх, ён павінен быў зрабіць пэўны крок у напрамку зьбліжэньня да ангельскага вар'янту разьвязаньня гэтых справаў (вольная рука Нямеччыны на яе ўсходзе...), аддзяліўшы справы польскія...

Вось, як здаецца, агульны сэнс адбыўшайся перамены ў францускім урадзе...

Гэнаральная забастоўка.

Клясавыя саюзы ўсіх капальняў і гутаў Верхняй Сілезіі (Шлёнску) абвесьцілі з 31/III агульную забастоўку. Прычынай яе зьяўляецца нарушэньне дагавораў капіталістычнымі магнатамі Шлёнску, якія дамагаюцца павялічэньня дня працы без павышэньня платы.

Маршал Фош у Мусоліні.

Маршал Фош прыехаў у Рым да Мусоліні, каб даведацца, як пішуць, ці можа Францыя абапёрціся на яго ўрад у „паразуменьні“ з Англіяй, ці Італія рашуча падтрымае Мак-Дональда...

Польскае obywatelstwo і міжнародныя трактаты.

Вэрсальскі трактат, які лёг у аснову незалежнасьці Польшчы і ў якім Польшча перад усім сьветам праз сваіх прадстаўнікоў паклялася аднолькава для ўсіх захоўваць правы народаў, якія ўвойдуць у яе склад, адносна да абыватэльства гаворыць так:

„Польшча прызнае за абыватэляў польскіх з самага права (папольску: „z samego prawa“, у францускім тэксьце: „plein droit“, у ангельскім тэксьце: „ipso fakto“) і бяз ніякіх фармальнасьцяў тых абыватэляў нямецкіх, аўстрыяцкіх, ці расейскіх, каторыя ў час, калі трактат гэты ўвойдзе ў сілу, будуць мець сталае замешканьне (domisilies) на тэрыторыі прызнанай, ці якая *будзе* прызнана за складовую часьць Польшчы“ (арт. 3 Разьдзелу Польшчы).

Тое самае гаворыцца (plein droit, ipso facto) і ў арт. 4 таго-ж разьдзелу аб тых, хто ў часе ўваходу ў сілу трактата знаходзіўся за межамі Польшчы, але хто па сваім праве зьяўляецца жыхаром якой-небудзь часткі тэрыторыі, увайшоўшай у склад Польшчы.

З гэтага відаць, што калі-б Вэрсальскі Трактат узапраўды выпаўняўся Польскім урадам, дык ніякага-б і пытаньня аб абыватэльстве Польскім ня было, ня трэба было-б ніякіх ані фармальнасьцяў, ані клапотаў, каб здабыць гэтае абыватэльства. Калі хто павінен быў-бы спаўняць нейкія фармальнасьці і клапаціцца перад урадам, дык гэта толькі тыя з жыхароў Польшчы, хто захацеў-бы адрачыся ад польскага абыватэльства і перайсьці ў якое-небудзь іншае падданства. У адносінах-жа да тых, хто ў часе ўзысканьня сілы Вэрсальскага трактату жыў у Польшчы (ізноў паўтараем) вымаганьне мінімальных фармальнасьцяў, напр., падачы звычайнай просьбы, або заявы аб абыватэльстве, ёсьць ужо безпадстаўнае беззаконства, бо ў трактаце ясна сказана, што ўсе лічацца абыватэлямі (падданымі) „бяз ніякіх фармальнасьцяў“. Такім чынам, усё тое, што вымагае ад нас адміністрацыя, пачынаючы ад міністра і канчаючы апошнім паліцыянтам у справе сьцьверджаньня абыватэльства, ёсьць пагвалчэньне тых нашых грамадзянскіх правоў, якія, здавалася, так моцна забясьпечаны Вэрсальскім трактатам.

Цяпер пагледзім, што робіцца ў Польшчы, каб як-небудзь стушаваць гэткае бясправе, каб зрабіць *перад сьветам* ня так прыкметнай несправядлівасьць да сваіх-жа ўласных грамадзян, вядома, найбольш ня польскай нацыянальнасьці, якім, як мы ўсе гэта ведаем, дабіцца польскага абыватэльства блізка што немагчыма.

Зроблена гэта было ў такім парадку. Урад за ўсё пастараліся звузіць паняцьце, якое разумеецца пад францускім словам „domisilies“. Слова гэтае азначае проста жыхара пэўнага мейсца. Слова гэтае ў такім іменна сэнсе ўжываецца, напрыклад, у Кодэксе Наполеона (гл. унёсак у Сойм пасла Грюнбаума і інш., сойм. друку № 179). Спачатку, як сьведчыць той самы дакумэнт, у польскім яго тэксьце стаяла слова больш адпаведнае да францускага тэксту, іменна: „zamieszkałe“, і толькі пазьней гэтае слова заменена на словы: „posiadają *stałe zamieszkania*“. Гэтая замена дала магчымасьць пасьля тлумачыць гэтае слова ў больш вузкім сэнсе. І вось, запраўды мы бачым, што ўжо ў уставе, якая была выдадзена 20-га студзеня 1920 году гэты артыкул растлумачаны гэтак: „за сталага жыхара (za osiedlonego) ў паньстве польскім лічыцца ў значэньні гэтае ўставы той, хто запісаны, ці мае права быць запісаным да кніг сталага насяленьня (stalej ludności) былога каралеўства Польскага (арт. 2, п. а) ці.... быў запісаны, ці мае права быць запісаным да гміны гарадзкое, ці вясковай, ці да аднэй з арганізацыяў саслоўных (stanowych) на землях былой Расейскай Імпэрыі, якія ўвайшлі ў склад Польшчы“.

З гэтага мы бачым, што францускае domisilies у гэтай уставе абмяжована яшчэ цясьней, тутака ўжо ня толькі трэба быць сталым жыхаром, але трэба быць, або мець права быць, *запісаным* да некаторых пунктуальна акрэсьленых кніг.

Але і гэтая ўстава ўсёж-такі дазваляе абыйсьці гэты пункт, бо ён ёсьць не адзіны ў ёй,—у ім паказаны і іншыя варункі прыналежнасьці польскага абыватэльства, якія паводле сэнсу гэтае ўставы самі па сабе, незалежна ад ksiąg stanowych, могуць быць пэўнай падставай права на абыватэльства. Напр. на абыватэльства, як гаворыцца там, маюць права „асобы, каторыя ўрадзіліся на абшары Польшчы“ (ар. 2 п. 2) „каторыя маюць на гэта права праз трактаты“ (арт. 2, п. 3) і г. далей...

Ужо пасьля гэтае Ўставы, у 1921 г. (18 сакавіка) быў падпісаны трактат Рыжскі, праз які адыйшла да Польшчы і значная частка Беларусі. І вось, у гэтым трактаце справа абыватэльства пастаўлена гэтак: „Усе асобы, каторым скончылася 18 гадоў і каторыя ў часе ратыфікацыі гэтага трактату знаходзяцца на абшары Польшчы, а ў дзень 1-га жніўня 1914 году мелі абыватэльства б. імпэрыі Расейскай і запісаны, ці

Барацьба работнікаў з прамыслоўцамі ў Англіі.

Барацьба паміж работнікамі і працадаўцамі расьце і пашыраецца. На забастоўкі апошнія адказываюць масавымі лёкаўтамі (выкіданьнем з працы)...

Так працадаўцы карабельных докаў пастанавілі выкінуць больш як 100.000 працаўнікоў...

У апошнія дні да агульнай забастоўкі працаўнікоў камунікацыяў у Лёндыне далучыліся і электратэхнікі.

Сітуацыя настолькі пагражаючая, што кароль падпісаў адозву, якая сьцьвярджае выняткова-небясьпечны стан рэчаў, што аўтаматычна надае ўраду і выняткоавыя паўнамоцтвы...

Першы работніцкі ўрад у Англіі будзе карыстацца выняткоавымі паўнамоцтвамі можа і для барацьбы з забастовачным рухам работнікаў!.. — Вось што значыць мець апору ў лібэралаў і весьці загранічную палітыку коштам унутранай...

Міністэрскі крызіс у Югаславіі.

Правадыр дэмакратычнай партыі, Давідовіч уручыў каралю мэморыял аб тым, што, калі кароль даручыць ізноў Пашычу састаўленьне габінэту, дык уся опозіцыя ў Скупшчыне зусім пакіне парлямэнт, што выклікала бы гаспадарствены крызіс. (?) Як ведама, Пашыч ужо сфармаваў габінэт, які быццам падтрымліваюць 15 дэмакратаў.

Плебісцыт у Грэцыі.

Плебісцыт у справе абвешчаньня рэспублікі адбудзецца 13 красавіка.

Абвал гары.

Грандыёзным абвалам гары, з прычыны землятрасеньня ці урагану, зруйнаваны шэраг мясцовасьцяў на пекным беразе Салернскага заліву паміж Салерно і Амальфі. Забіта больш 100 асобаў. Матар'яльныя страты вялізарныя. Абвал здарыўся за колькі мінутаў перад праходам па берагу цягніка, на якім ехаў кароль...

З газэт.

Пуанкарэ, Польшча і Літва.

„Пабеда Пуанкарэ“, якому ізноў было даручана ўлажэньне габінэту пасьля яго „прыпадковае“, як піша „Gaz. Warsz.“, адстаўкі,— выклікае сярод польскіх нацыяналістаў і імпэрыялістаў нязвычайную радасьць: у гэтым яны бачаць доказ, што Францыя ў сваей загранічнай палітыцы будзе йсьці і далей па дарозе захватаў чужых зямель і... падтрымліваньня Польшчы.

Што датычыцца апошняга, дык яшчэ „надвое бабка варажыла“: пазіцыя Францыі ў адносінах да Нямеччыны, а значыць і да Польшчы, будзе залежаць не ад таго, ці далей францускую палітыку павядзе Пуанкарэ, ці нехта другі, а ад таго, ці францускі ўрад дагаворыцца з Англіяй, ці не. Бо-ж газэты нядаўна пісалі, што англічане гатовы былі забясьпечыць Францыю ад нападу Нямеччыны, але ня Польшчу!

Усё-ж польскі нацыяналізм трыумфуе і распачынае цэлую кампанію проці найслабейшага з суседзяў—проці Літвы. У Вільні польскія абшарнікі, землі якіх асталіся пад Літвой, ладзяць мітынгі пратэсту проці „літоўскіх гвалтаў“, а пасьля польская прэса раздзьмухівае гэныя „пратэсты“ ў нешта вялізарнае.

„Gaz. Warsz.“ піша ў перадавіцы з 30 сакавіка:

> За апошнія часы літоўская дзяржаўка захоўваецца ў адносінах да Польшчы ўсё больш дзерзка, прост вызываюча. Палякі, якія жывуць у Літве, цалком аддадзены самавольству адміністрацыйнае ўлады; у іх забіраюць зямлю на аснове закона і паміма яго; іх выкідаюць з краю бяз ніякае прычыны; польскую мову прасьледуюць у касьцеле і ў школе.

Як бачым, палякі закідаюць літвіном акурат усё тое, што самі робяць з беларусамі... І на грунце гэтых закідаў эндэцкая прэсса пачынае званіць аружжам. Але робіцца гэта дужа дыпляматычна: палякі вінавацяць у ваяўнічых плянах... Літву! Тая-ж „Gaz. Warsz.“ піша, што

> Літва зусім не рахуецца з польскай дзяржавай: зачыняе свае граніцы для польскага гандлю, абвяшчае яўна і публічна, што знаходзіцца ў стане вайны з Польшчай, урэшце заяўляе проста аб адабраньні Вільні.

Такое становішча Літвы „Gaz. Warsz.“ прыпісывае таму, што за Літвой укрываецца Нямеччына:

> Калі немцы рыхтуюцца да вайны і ў першы чарод да вайны з Польшчай, дык няма ніякага сумліву, што хочуць уцягнуць у свае пляны і Літву, карыстаючы з яе заядласьці на палякоў. Нават, хто ведае, ці не Літве празначылі ролю ініцыятара барацьбы, да якое пасьля павінны былі-бы ўмяшацца немцы ў імя суседзкага абавязку.

І ў адказ на заяву літоўскага прэм'ера Гальваноўскага аб пратэнсіях Літвы да Вільні эндэцкі орган піша:

> Пасьля апошніх пагрозаў п. Гальваноўскага ня было-б нічога дзіўнага, калі-б нашая ўлада (—польская) пачала падазраваць літвіноў у тым, што яны маняцца зрабіць наезд на Віленшчыну, і калі-б з свайго боку ўчыніла некаторыя крокі забясьпечаньня. А калі абедзьве старыны апынуцца ў стане ўзьвялічанае чуйнасьці, дык найменшае здарэньне можа выклікаць стычку.

Не дарма кажуць, што ў такіх прыпадках гарматы самыя пачынаюць страляць!

Аднак, паўглядаўшыся на ўнутранае палажэньне Польшчы, трэба прызнаць, што яно—ня гледзячы на пабеду Пуанкарэ — не дае магчымасьці Польшчы паважна думаць аб якой-колечы вайне. На перашкодзе стаяць яе фінансы. Аб эканамічным палажэньні Польшчы, ад якога залежаць і яе фінансы, дужа шчыра і адкрыта гаворыць п. І. Гозэр у сваім „адкрытым пісьме да п. Прэзыдэнта Рэчыпаспалітай“, надрукаваным у варшаўскіх газэтах. Аўтар пісьма гаворыць, што ў Польшчы

> вытворчая праца не аплачываецца і вядзе да нэндзы. Аплачываецца ў нас толькі спэкуляцыя, ліхвярства і шахрайства... Дабываньне вугальля ў Домброве і ў нашым Горным Шлёнску каштуе шмат даражэй, чым за гранічнай мяжой— у Нямеччыне і Чэхаславакіі. Свой кошт большасьці валакністых вырабаў на 20—60 % вышэй, чым на Захадзе. Кілёграм пшоннае булкі каштуе ў нас на 40 % даражэй, як у Парыжу... Няма ўжо, бадай, такое галіны прамысловасьці, прадукты якое мы маглі-бы вывазіць на продаж па сабекоштнай цане....

Запраўды, у такім палажэньні ня толькі Хільтон Юнг, але і „сам“ Пуанкарэ мала можа памагчы, а калі-б і мог, дык ці захоча?!

Польскі голас аб аб'яднаньні Усходняе Беларусі.

У сувязі з аб'яднаньнем усходня-беларускіх зямель з Радавай Беларусяй выдаваная ў Вільні часопісь „Przegląd Wileński“, адзіная запраўды прыхільная да беларусаў і літвіноў, да апошняга часу глядзеўшая, аднак, на Заходнюю Беларусь, як на нешта абасобленае ад Усходняе, піша ў нумары з 23 сакавіка:

> Эўропа і ўвесь сьвет, дзякуючы аб'яднаньню усходніх зямель Беларусі, убачаць на гістарычнай арэне зьліты тэрыторыяльна і языкова народ, які ў сілу рэчаў ня можа забыцца і ніколі не забудзецца аб сваей жывой часьці—Заходняй Беларусі, што займае верхняе і сярэдняе цячэньне Нёмна і яго прытокаў і за заходнюю сваю акраіну мае Беласток.
>
> Аб'яднаньне Усходняе Беларусі меціме вялікае маральнае значэньне, ды ня меншае за яго агітацыйна-палітычнае. Паклоньнікам рэлігійнае, ідэйнае і культурнае абасобленасьці Заходняе Беларусі, якія, станоўча выказываючыся на карысьць Захаду, хацелі-бы гэную абасобленасьць заўсёды бараніць ад цеperазмернае экспансіі усходніх уплываў, гэты факт выбівае грунт спад ног.

Канчае аўтар сваю стацьцю гэткай заявай:

> Можна сказаць, што вясна 1924 году разам з першымі праменьнямі сонца прыносіць беларусам заканчэньне першага этапу дзяржаўнатворчае працы, распачатае шалёна-сьмелым, пры найгоршых спадзяваньнях і нястачы сіл і засобаў, абвешчаньнем незалежнасьці Беларусі ў Менску 25 марца 1918 году.

Увага зусім справядлівая. І не дарма эндэцкі „Dziennik Wileński“ бесіцца ад злосьці і піша сьмешны данос, быццам беларусы 25 сакавіка сьвяткавалі ўгодкі стварэньня Радавае Беларусі (абвешчанае не 25 сакавіка 1918 г., а 1 студзеня 1919 г.!),—і то па загаду з Менску...

Цяпер ужо няма ў беларусаў тае „ахільлесавае пяты“, у якую маглі-бы кусаць нас розныя „обсты“!

З Польскага Сойму.

Інтэрпэляцыі паслоў Беларускага Клюбу.

Беларускімі пасламі ў Сойме ўнесены інтэрпэляцыі да адносных міністраў:

1) у справе касавых надужыцьцяў і нясумленнай гмінай гаспадаркі войта гміны Пасынкі, Бельскага павету А. Хамінскага;

2) у справе беспадстаўнага звальненьня са службы сьледчага судзьдзі III раёну Дзісьненскага пав. Віктара Багданава, службовых надужыцьцяў вышэйшых урадоўцаў Польскай Рэспублікі;

3) у справе неадпаведнага выкананьня абавязкаў войтам Сьвержанскай гміны, Стаўпецкага павету;

4) у справе надужыцьцяў над праваслаўнай парафіяй у м. Плонках, Баранавіцкага павету і

5) прапазіцыя ў справе адабраньня ад праваслаўных царквы ў в. Весялусе, Дунілавіцкага павету.

маюць права быць запісанымі да кніг сталага насяленьня былога каралеўства Польскага, ці былі запісаны да гміны гарадзкое ці вясковай, альбо да аднэй з саслоўных арганізацыяў на землях б. імпэрыі Расейскай, якія ўваходзяць у склад Польшчы, маюць *права злажыць просьбу на прадмет* атрыманьня абыватэльства расейскага, або украінскага. Ад былых абыватэляў б. імпэрыі Расейскай іншых катэгорыяў, якія знаходзяцца ў мамэнт ратыфікацыі гэтага трактату на тэрыторыі Польшчы гэткая заява ня ёсьць патрэбна. (Traktat Pokoju w Rydze 18.III.21, art. VI p.1). Пункт 3 гэнага-ж трактату пашырае гэтае права і на тых асоб, якія знаходзяцца „poza granicami Polski“.

Згодна з сэнсам гэтых артыкулаў, кожны абыватэль Польшы, хоць-бы ён быў запісаны да „ksiąg stanowych“ ці іншых катэгорыяў, незалежна ад таго ці ён жыў у Польшчы ў часе ратыфікацыі Рыжскага Трактату, ці знаходзіўся за межамі Польшчы (напр. у свой час у Літве Сьродковай), мае права падаць заяву [на] права атрыманьня абыватэльства другой дзяржавы. [З] гэтага бязспрэчна вынікае, што калі гэтая асоба з гэтага права не скарыстала,—яна тым самым становіцца абыватэлем Польшчы ipso facto і „bez żadnej formalności“, як „маючая сталае замешканьне на тэрыторыі прызнанай, альбо якая будзе прызнана за частку, складаючую Польшчу (Арт. 3, Разьдзел аб Польшчы, Вэрсальскага Трактату). І наадварот, адмова ад гэтага права на абыватэльства, насупроць арт. VI Рыжскага Трактату, зьяўляецца ўжо вымаганьнем абыватэльства іншае дзяржавы, але аб абыватэлях іншых катэгорыяў у Рыжскім Трактаце нічога не гаворыцца.

Гэткім чынам з усяго вышэйказанага вынікае, што міжнародныя трактаты асабліва Вэрсальскі, па сутнасьці вельмі шырока расчыняюць дзьверы для абыватэльства польскага і занепакоіваюцца галоўным чынам аб лёсе тых, хто *не захоча быць* падданым Польшчы, даючы права абыватэльства блізка што ўсім, хто ў мамэнт ратыфікацыі трактатаў жыў на абшарах ня толькі тагачаснай, але і будучай (на выпадак пашырэньня тэрыторыі) Польшчы. Пры гэтым адкідаюцца ўсе абсалютна фармальнасьці, каторых ніякая ўлада *ня мае* права вымагаць, бо абыватэльства набываецца не паперамі, а ipso fakto... А што польскі ўрад гэтае *павінен* спаўняць, гэта відаць ясна з арт. 1 гэтага-ж разьдзелу Вэрсальскага Трактату, у якім гаворыцца: „Польшча абавязуецца, што пастановы, зложаныя ў арт. 2—8 гэтага разьдзелу будуць прызнавацца за правы асноўныя (fondomentoles), што ніякая ўстава, ніякое распараджэньне, ніякая небудзь урадовая дзейнасьць ня будзе пярэчыць, ці супярэчыць гэтым пастановам, што ніякая ўстава, ніякае распараджэньне, ані таксама ніякая дзейнасьць ураду праціўная ім ня можа мець сілы“.

У жыцьці мы бачым іншае: Польскі ўрад ня толькі не спаўняе гэтых трактатаў, але выдае свае ўставы, якія ім пярэчаць. Гэтыя ўставы не павінны *мець сілы*, а ўрад прымушае нас спаўняць іх.

Што-ж датычыць трактату Рыжскага, дык урад скарыстаў яго вельмі ўмела. Дзякуючы таму, што ад грамадзян б. імпэрыі Расейскай „innych kategoryj“, г. ё. незапісаных да кніг сталага насяленьня ці інш., не вымагаецца паданьне заяў аб сваім чужаземным падданстве, дык урад усіх гэткіх залічыў агулам да *не абыватэляў* Польшчы і стаў на той паглядзе, што Вэрсальскі трактат ужо непатрэбен, бо ёсць Рыжскі, які лягчэй тлумачыць у другі бок, чымся [...], уставу 1920 г., якая ўсё-ж дае некаторыя магчымасьці папасьці ў абыватэлі і тым, хто не запісаны да кніг stanowych. Сталася так, што папасьці ў абыватэлі можна не па закону, а толькі з „ласкі“. Аднак далей урад не спаўняе нават і сваіх уставаў. У ўставе 20—I—20 г. гаворыцца, напр., што за „osiedlonych“ у Польшчы лічацца тыя, хто запісаны „до ksiąg stałej ludności“, а ад нас вымагаюць абавязкова „ksiąg stanowych“. У ўставе гаворыцца, што абыватэльства даецца ўсім, каму яно належыць па трактатам, а трактат Вэрсальскі ўневажняецца гэтай жа ўставай, якая вымагае розных фармальнасьцяў і дакумэнтаў ад бязспрэчных абыватэляў Польшчы; у ўставе гаворыцца, што абыватэльства набываецца дзяржаўнай службай, а ў нас urzędniki звальняюцца са службы за тое, што ня маюць абыватэльства і гэтак далей і далей... Усяго не пералічыш, і мы гэтае пакідаем тым, што захоча напісаць аб гэтым кніжку, а не застанавіцца ў цесных рамках газэтнага артыкулу.

А розныя іншыя ўціскі і выбрыкі мясцовае ўлады, якая, хочучы выслужыцца, наперабой стараецца адна перад аднэй паказаць сваю шчырасьць—гэтага і ў кнізе не апішам, — зложыцца цэлая бібліатэка.

Адным словам, вынікам усей гэтай дзейнасьці зьяўляецца тое, што мат людзей, якія маюць бязспрэчнае права на абыватэльства, то усё-ж такі дастаць ня могуць, а тыя, хто часам, праваў ніякіх ня маюць, пры помачы тэй жа ўставы, якая, быццам, „пашырае“ рамкі Вэрсальскага трактату, абыватэльства даўно ўжо дасталі. Што-ж гэта значыць? Дзе прычына? А прычына ўсё тая ж: Польшча мае *грамадзян 1 ае і 2-ое катэгорыі*. Хто належыць да 1 ае, а хто да 2-ое—тлумачыць ня трэба...

Civis.

З УСЯЕ БЕЛАРУСІ.

ЗАХОДНЯЯ БЕЛАРУСЬ.

ХРОНІКА.

Канфіската № 14 „Голасу Беларуса“.

Па загаду Камісара Ураду гор. Вільні канфіскаваны № 14 „Голасу Беларуса“ за артыкул „Незалежнасьць і залежнасьць“.

Лекцыя Яз. Драздовіча. 23 сакавіка с. г. ў Вільні, у Базыльянскіх мурох адбылася лекцыя гр. Драздовіча аб будаўніцтве старадаўняй Беларусі, якая зрабіла прыемнае ўражаньне на слухача, як з боку навуковага, так і з боку хараства. З апошняга пункту гледжаньня, асаблівую ўвагу зьвяртала на сябе чарга ілюстрацыйных абразкоў, вельмі прыгожа выкананых. Талентны мастак—маляр, ня гледзячы на цяжкія варункі сваёй падгатаваўчай працы і беднасьць матар'ялу (звычайны вугаль і газэтная папера), здолеў улажыць у іх ня толькі праўдзівасьць старадаўняй будоўлі, але і задавольніць вока слухача з боку хараства. Малюнкі паступова раскрывалі слухачам стадыі разьвіцьця будовы нашых дзядоў, пачынаючы ад каменнага веку, да цяперашніх часоў. Лектару заставалася толькі пашырыць і паглыбіць тэму, але, на жаль, гэтага ня было зроблена, дзеля чаго лекцыя дужа ўтраціла ў сваёй паўнаце і яснасьці. Але і так належыцца шчырая падзяка зьбіральніку нашае мінуўшчыны, працуючаму ў самай гушчы народнай, сярод палёў і лясоў адвечных, аддаючы працы свой мазольны грош, сілы і душу.

Падзяка. Камітэт помачы ахвярам вайны выказвае шчырую падзяку сялянам вёсак: Зарэчча, Манеўшчына, Дзярацінцы, Вароцішча, Падлесьсе, Новая Вёска, Круты Бераг, Краснагоркі, Астроўкі, Ябланоўшчына, Просьце, Стаўпішча, Янчыцы, Нова-Лысіца, Вялікая Лысіца, Забалоцьце, Канюшчына і інш. Гарадзейскай гміны, Нясьвіскага павету за ахвяры, сабраныя для сіротаў Беларускага прытулку ў Вільні.

Мітынг. 23 сакавіка, у мяст. Докшыцы пасол Мятла зрабіў справаздаўчы мітынг. На мітынгу сабрана ахвяраў на прэсовы фонд 15.850.000 м. п.

Весткі з вёскі.

В. Вялікая Кракотка, Слонімскага павету.

Кожны з нас дабра яшчэ памятае восень 1922 году, калі па нашаму краю, празванаму „ўсходнімі крэсамі“ (бо мусіць паном вельмі не падабаецца назоў „Беларусь“) разсыпаліся агітатары розных партыяў ад левых да правых уключна. Кожны з іх раскідаў соткі, а мо' й тысячы паперкаў на нашай роднай мове. Абяцанкам ня было канца. Кожны, як дзяцей, гладзіў па галоўцы. Тады й мы былі людзьмі, тады і ў нас была свая мова. І аддаючы свае галасы, мы спадзяваліся, што і ў нас ўсё будзе, як у добрых людзей—што хаты нашы адбудуюцца, надзеляць зямелькай, дзеткі пачнуць навуку ў роднай мове, а ў „urzędach“ з намі пачнуць гаварыць, як з людзьмі.

Але прайшоў год, мінуў другі, а паляпшэньня жыцьця мы ня бачым, хутчэй наадварот. Апошні наш лясок—садок ужо ў кішані спэкулянта. Ніхто з сялян, якія бадай усе былі ў бежанцах, а вярнуўшыся знайшлі заместа роднай хаты, толькі зарослы быльлём двор, не атрымаў ані воднае хвойкі, а толькі плацім за гнілое гальлё штрафы. І зямлі не далі—за то маем асаднікаў. Падаткам няма канца — то „асадніцы“, то „засадніцы“, то „жондовы“, то „павятовы“, — хвароба іх ведае—усіх і не пералічыш! Ня лепш і з страхоўкаю: леташнюю вясною ўзялі, і ў восень ўзялі, а сёньня зноў бяруць, але ўжо ў франках. Цяпер цягнуць яшчэ нейкую ссыпку за тры гады, калі мы яшчэ былі ў Расеі, у бежанцах... Самім няма чаго есьці, бо леташні год, каб не крапіва, дык памёрлі-б з голаду, дый гэты год бачым зерня, толькі, як малоцім, а ссыпку трэба даваць. Плацім падаткі і за коні, і за каровы, хоць бяз харчоў яны ледзь ногі валочаць. Падыходзіць пара араць, а тут трэба прасіць людзей, каб паднялі на ногі, бо сама жывёла ня ўстае.

Дзетак вучыцялі штрафуюць за кожнае беларускае слова. Напрыклад, перад Калядамі ў вёсцы Сялявічах, Міжэйскай гміны, Слонімскага павету, была аштрафавана вучыцелькай Шостакувнай дзесяцігадовая вучаніца, дачка Сьцяпана Саркевіча, за два словы, якія яна сказала пабеларуску на пераменцы. Штраф, праўда, невялікі, але дзяўчынка да таго напалохалася, што доўга не магла гаварыць ні пабеларуску, ні папольску... А бяз роднае мовы дзіця, што птушачка ў клетцы. Усялякую культурную працу забараняюць. І так стогне не адна наша вёска, а ўся сялянская Беларусь! **Жыхар.**

Не даюць школы ў роднай мове.

(в.Назлы, Парпліскай вол., Дунілав. пав.)

У лістападзе 1922 году грамадзяне нашай вёскі два разы падавалі Школьнаму Інспэктару прыгавор, які падпісаны быў 60 асобамі, аб адчыненьні ў нас беларускай школы. Дзяцей у школьным веку налічваецца ў нашай вёсцы да 60. Але школы дасюль ня маем. На пісьме інспэктар даў адказ, што вучыцель павінен скончыць 7 клясаў гімназіі, а высланай да яго дэлегацыі адказаў, што ня можа быць нават гутаркі аб адчыненьні беларускай школы.

Каб як-небудзь даць асьвету сваім дзецям нашы сяляне на свой кошт заложылі прыватную школу і паведамілі аб гэтым інспэктара, але інспэктар прыказаў зачыніць школу, што паліцыя і выцяніла.

Падавалі прыгавар і ў гэтым годзе, але вынік той самы. Кругом нас усе вёскі жадаюць мець школы ў сваёй роднай мове, але школьныя ўлады адчыняюць толькі польскія, у якія дзеці нашы ня ходзяць, бо ня могуць вучыцца ў незразумелай для іх мове.

Пятрук.

УСХОДНЯЯ БЕЛАРУСЬ.

Пашырэньне БССР і каапэрацыя.

Цэнтрабелсаюз ужо ўстанавіў сувязь з цэлым шэрагам мейсц Усходняй Беларусі.

У Оршы, Магілёве і Віцебску адбываюцца нарады з прадстаўніцтвам ад ЦБС па пытаньню аб утварэньні ў гэтых гарадох раёнамых саюзаў, спажывецкай каапэрацыі.

Да зьезду беларускіх глебазнаўцаў.

Нядаўна ў агранамічнай сэкцыі Інбелкульту праф. Касаткіным быў зроблены даклад аб глебазнаўчых досьледах на Беларусі.

Сэкцыя знайшла неабходным склікаць вясной гэтага году зьезд беларускіх глебазнаўцаў.

Дзяржаўная плянавая камісія ідзе на спатканьне агранамічнай сэкцыі ў гэтай справе і адпушчае на правядзеньне зьезду патрэбныя сродкі.

Спрос на беларускія кнігі.

У зьвязку з аб'яднаньнем у Віцебшчыне і Гомельшчыне ўзрастае спрос на беларускія кнігі, у якіх адчуваецца недахват.

Хроніка беларускае культуры.

Беларускі сэктар паэтаў.

Прадстаўнікі Ўсерасейскага Саюзу паэтаў--Рурык Іўнеў і Ройзманаў нядаўна былі ў Менску. Яны прыехалі ў Радавую Беларусь з Масквы са спэцыяльнаю мэтаю: завязаць культурную сувязь з беларускім Парнасам.

Між іншым, яны лічылі патрэбным арганізаваць беларускі сэктар паэтаў, які ўвайшоў-бы ў склад Усерасейскага саюзу паэтаў. З гэтае прычыны была склікана канфэрэнцыя беларускіх паэтаў у Менску, дзе пытаньне культурнай сувязі з расейцамі было абгаворана з усіх бакоў. У рэзалюцыі, за якую галасавала большасьць канфэрэнцыі, адзначаецца патрэбнасьць сувязі і прапануецца праўленьню Усерасейскага саюзу паэтаў узяць на сябе ініцыятыву склікаць зьезд паэтаў усіх нацыянальнасьцяў СССР, каб заснаваць міжнародны саюз паэтаў, у які беларускія паэты ўвойдуць, як самастойная сэкцыя.

Пераклады з беларускае мовы.

Пытаньне з перакладамі беларускае паэзіі на расейскую мову пастаўлена на пэўны грунт.

Наладжана сувязь менскіх паэтаў з петраградзкімі. Яшчэ ў 1923 годзе паэтэсы М. Шкайская, Паўловіч і малады здольны паэта Ціханаў зацікавіліся нацыянальнаю беларускаю літэратураю і прасілі прыслаць ім зборнікі вершаў Я. Купалы, Я. Коласа, М. Чарота для перакладаў.

Маскоўскі парнас зацікавіўся адраджэньнем беларускае паэзіі трошкі пазьней. Група імажыністаў прапануець беларускім паэтам культурнае супрацоўніцтва з прычыны таго, што беларуская паэзія вельмі багата абразамі і, такім чынам, родная імажынізму. Супрацоўніцтва павінна пачацца перакладамі на беларускую мову найлепшых твораў расейскіх паэтаў і наадварот.

Беларуская група паэтаў „Маладняк“.

У Менску арганізавалася група беларускіх паэтаў з рэвалюцыйным напрамкам пад назваю „Маладняк“. У гэтую групу ўваходзяць М. Чарот, Александровіч, А. Вольны Дудар, Бабарэка, Дзямідовіч, Чарнушэвіч і інш. Усяго ў групе налічваецца да 15 паэтаў. З старых песьняроў у групу „Маладняк“ увайшоў З. Бядуля.

Група ладзіць літэратурныя вечары і дысьпуты ў пэдтэхнікуме, унівэрсытэце, выяжджае на паветы і нават на вёску, дзе выступае са сваімі творамі перад беларускаю моладзьдзю. Усюды „Маладняк“ мае вялікі пасьпех.

Новы беларускі паэта Анатолі Вольны.

Многія беларускія паэты, дзякуючы таму, што прайшлі толькі расейскую школу, пачыналі пісаць парасейску і потым пераходзілі на беларускую мову.

Тое самае мы бачым і цяпер. У групу „Маладняк“ увайшоў нядаўна малады, гарачы, з імажыністскаю афарбоўкаю паэта Анатолі Вольны, які да 1924 году пісаў толькі парасейску. Цяпер А. Вольны вельмі ўдачна пачаў пісаць пабеларуску. Сам ён беларус, родам з Ігуменшчыны. Першыя творы яго пабеларуску надрукаваны ў №№ 1, 2 і 3 часопісі „Маладняк“.

Беларусы і Украінцы.

У Харкаве істнуе вельмі моцная Украінская група паэтаў і пісьменьнікаў пад назваю „Плуг“.

Паміж „Плугом“ і беларускімі паэтамі наладзілася сувязь. У Харкаве, з прычыны гэтага, былі дзьве літэратурныя вечарыны, ахвяраваныя новай беларускай паэзіі і літэратуры. На апошняй літэратурнай вечарыне, якая адбылася ў лютым г. г., з вялікім дакладам аб адраджэньні беларускае літэратуры выступіў Дыла. Потым былі зачытаны вершы Чарота, Цішкі Гартнага і іншых, а ўкраінскія паэты чыталі пераклады з беларускага на ўкраінскі.

Беларускі рух у Смаленшчыне.

Гурток беларусазнаўства ў Соінскай воласьці.

Канфэрэнцыя асьветы Соінскай воласьці, Мсьціслаўскага павету пастанавіла арганізаваць культурна-асьветны гурток.

Мэтамі гуртка зьяўляюцца:

1) *навучыцца беларускай мове,*

2) *азнаёміцца з беларускай літэратурай,*

3) *зьбіраць у сваёй мяйсцовасьці матар'ялы па беларускай народнай творчасьці.*

Гурток у хуткім часе распачынае сваю працу.

Прэміі за палепшаныя спосабы вядзеньня сельск. гаспадаркі.

Дэкрэтам аб адзіным сельска-гаспадарчым падатку было ўведзена прэміраваньне за палепшаныя спосабы вядзеньня сельскае гаспадаркі.

У зьвязку з выданьнем гэтага дэкрэту быў утвораны спэцыяльны фонд для прэміраваньня гаспадарак.

Прэміравальны фонд для Беларусі складаў 130.000 жытніх адзінкаў.

Частка гэтай сумы—63.000 адзінкаў была скарыстана для прэміраваньня гаспадарак шляхам зьмяншэньня належачага ад іх с.-г, падатку.

Такім чынам, засталося нескарыстанымі яшчэ 67.000 жытніх адзінкаў.

Народны Камісарыят Земляробства скарыстае гэтую частку фонду шляхам выдачы прэміруемым гаспадаркам камплекту с.-г. прыладаў, насеньня і інш.

Ужо пачата рэалізацыя другой часткі фонду.

На кожны павет назначаны ўжо вядомы лік прэміяў, якія ў хуткім часе будуць разьмеркаваны сярод прэміруемых вёсак і асобных гаспадарак.

Прычым усе прэміруемыя гаспадаркі падзелены на 4 групы.

У першую групу ўваходзяць цэлыя вёскі, калектыўныя гаспадаркі і с.-г. каапэратывы. Для першай групы Народны Камісарыят Земляробства выдаў па 10 прэміяў на кожны павет.

Прычым кожная прэмія складае ад 145 да 600 чырв. руб.

У другую групу ўваходзяць культурна-прыкладныя гаспадаркі.

Для другой групы выдадзена па 30 прэміяў на павет, кожная з якіх складае ад 15 да 55 чырв. руб.

Трэцюю групу складаюць асобныя гаспадаркі, у якіх уведзены палепшаныя спосабы вядзеньня гаспадаркі: травапольны севазварот, чорны пар ці інш.

Для прэміраваньня асобных гаспадарак выдадзена па 50 прэміяў на павет, кожная з якіх складае ад 10 да 15 чырв. руб.

Уся рэшта прэміруемых гаспадарак складае 4 групу.

Для 4 групы выдадзена па 40 прэміяў на павет (ад 6 з паловай да 10 руб. кожная).

Ці споўнілі Вы свой абавязак адносна Цэнтр. Беларускай Школьнай Рады? Ці заплацілі Вы належачую ад Вас грашовую складку за гэты месяц?

Друкарня Левін і Сын. Вільня, Нямецкая 22.